Псіхалогія

УДК 370.153

*Я.Л.Каламінскі*

# Праблема фарміравання асобы ў калектыве ў святле ідэй Л.С.Выгоцкага

За праблемай сацыялізацыі, якая раскрывае характар сувязі асобы і сацыяльнага асяроддзя, ляжыць вельмі глыбокі псіхалагічны пласт, які прыводзіць да галоўнага пытання: якім чынам асоба і калектыў, узаемна уплываючы, "лепяць" адзін аднаго? Частае паўтарэнне формул "калектыў — асоба", "фарміраванне асобы ў калектыве" і г.д. набыло той "хрэстаматыйны глянец", які стварае ілюзію вырашанасці, зразумеласці усім вядомай праблемы. Тое, што гэта ілюзія, ясна выяўляецца пры спробе зрабіць аналіз канкрэтных псіхалагічных механізмаў гэтага працэсу ў псіхолага-педагагічных даследаваннях, падручніках па педагогіцы і педагагічнай псіхалогіі. Не дзіўна, што практычныя рэкамендацыі, якія маюць месца, у выніку зводзяцца да парад, заснаваных на разумным сэнсе і абагульненні эмпірычнага вопыту выхавання у сям'і і школе.

Крытычны пафас прыведзеных разважанняў мы пакуль не ў стане напоўніць ці цалкам "забяспечыць" уласнай цэласнай тэарэтычна абгрунтаванай і эксперыментальна праверанай канцэпцыяй псіхалагічных механізмаў фарміравання асобы ў калектыве. (Для скарачэння тэрміны "калектыў" і "група" ў далейшым будуць выкарыстоўвацца як сінонімы.)

Адначасова мы лічым наступнае: па-першае, немалаважна ўсведамляць сам факт нявырашанасці гэтай актуальнай праблемы; па-другое, паказаць нашы даныя ў аспекце пошукаў шляхоў яе рашэння. Тэарэтычныя прадпасылкі для вырашэння праблемы "асоба і калектыў" у плане антагенезу змяшчаюцца ў выказваннях класіка сучаснай сусветнай псіхалогіі, ураджэнца Беларусі Л.С.Выгоцкага, якія пакуль не ўвайшлі у арсенал псіхолага-педагагічных даследаванняў. Калі гавораць аб вучоных, якія ўнеслі уклад у вывучэнне праблем адносін, узаемадзеяння асобы і калектыву, імя Выгоцкага амаль не называецца. Таму ёсць сэнс коратка напомніць аб фундаментальных тэарэтычных палажэннях, распрацаваных Выгоцкім, якія непасрэдна закранаюць цікавыя для нас праблемы.

"Праз другіх, — піша Выгоцкі, — мы становімся самімі сабой, і гэта правіла датычыцца не толькі асобы ў цэлым, але і гісторыі кожнай асобнай функцыі. Асоба становіцца для сябе тым, што яна ёсць у сабе, праз тое, што яна ўяўляе для другіх. Гэта і ёсць працэс станаўлення асобы" [2, с. 144]. Тут падкрэсліваецца адлюстраваны рэфлексіўны характар самасвядомасці асобы. Далей апісваецца пра-

цэс узнікнення у асобе таго, "што яна ёсць у сабе", таго, што асоба "уяуляе для другіх".

Такі па сваей прыродзе унутрыасобасны працэс — вытворнае ад міжасобаснага працэсу сацыяльнага, дакладней, сацыяльна-псіхалагічнага узаемадзеяння. У гэтым сутнасць сфармуляванага Выгоцкім агульнага генетычнага закону культурнага развіцця, згодна якому "усякая функцыя у культурным развіцці дзіцяці з'яуляецца на сцэну двойчы, у двух планах, спачатку сацыяльным, потым псіхалагічным, спачатку паміж людзьмі як катэгорыя інтэрпсіхічная, потым унутры дзіцяці як катэгорыя інтрапсіхічная" [2, с.145]. І далей: "Усе вышэйшыя псіхічныя функцыі ёсць інтэрыярызаваныя адносіны сацыяльнага парадку, аснова сацыяльнай структуры асобы. Іх склад, генетычная структура, спосаб дзеяння — адным словам, уся іх прырода сацыяльная, нават ператвараючыся у псіхічныя працэсы, яна застаецца квазісацыяльнай. Чалавек сам-насам з сабою захоувае функцыі зносін" [2, с. 146].

Асаблівае значэнне у дадзеным кантэксце уяуляюць далейшыя разважанні, дзе Выгоцкі прама гаворыць аб псіхалагічных механізмах узаемадзеяння асобы і калектыву. Ён крытыкуе спробы "вывесці сацыяльнае" з індывідуальных паводзін. З яго пункту гледжання, "першая задача аналізу — паказаць, як з форм калектыунага жыцця узнікае індывідуальная рэакцыя". Адсюль "уся псіхалогія калектыву у дзіцячым развіцці прадстауляецца у новым свеце. Пытаюцца, як тое ці іншае дзіця паводзіць сябе у калектыве. Мы пытаемся, як калектыу будуе у таго ці іншага дзіцяці вышэйшыя псіхічныя функцыі... Функцыі спачатку складаюцца у калектыве у выглядзе адносін дзяцей, потым робяцца псіхічнымі функцыямі асобы" [2, с.146-147].

Больш дакладна гэтыя палажэнні сфармуляваны Выгоцкім у рабоце "Коллектив как фактор развития дефективного ребенка" [3]. "У адносінах антагенезу да развіцця дзіцяці толькі у апошні час з дапамогай шэрагу даследаванняу было устаноулена, што пабудова і фарміраванне вышэйшых форм псіхічнай дзейнасці завяршаецца у выніку сацыяльнага развіцця дзіцяці, у працэсе яго узаемаадносін і узаемадзеяння з сацыяльным асяроддзем. Абапіраючыся на некаторыя нашы і нашых супрацоунікау даследаванні, мы сфармулявалі у другім месцы гэта палажэнне наступным чынам: назіранне за развіццём вышэйшых функцый паказвае, што пабудова кожнай з іх падпарадкоуваецца адной і той жа заканамернасці, а іменна: кожная вышэйшая псіхічная функцыя узнікае у працэсе паводзін двойчы — спачатку як функцыя калектыуных паводзін, як форма супрацоуніцтва ці узаемадзеяння, як сродак сацыяльнага прыстасавання, т.ч. як катэгорыя інтэрпсіхічная, а потым як здольнасць індывідуальных паводзін дзіцяці, як сродак асобнага прыстасавання, як унутраны працэс паводзін, т.ч. як катэгорыя інтрапсіхалагічная.

Прасачыць пераход калектыуных форм супрацоуніцтва у калектыуныя формы паводзін дзіцяці — значыць улавіць прынцып будауніцтва вышэйшых псіхічных функцый у іх станауленні"[3, с.179].

Гэта вялікая цытата прыведзена невыпадкова. У той час, пры жыцці Выгоцкага, іншыя яго працы не былі вядомымі. Таму псіхолагі і педагогі мелі магчымасць толькі па гэтай рабоце пазнаёміцца з яго поглядамі па дадзенаму пытанню, якое сёння вызначаецца у якасці праблемы фарміравання асобы у калектыве. Кніга "История развития высших психических функций" пры жыцці аутара не была апублікавана. Цытаваны артыкул Выгоцкага, які быу надрукаваны у часопісе "Вопросы дефектологии", напэуна, прайшоу міма тагачасных спецыялістау. Аналіз адпаведнай літаратуры таго часу (вынікі прадстаулены у нашай кнізе "Психология взаимоотношений в малых группах"[4] паказау, што сляды знаёмства з ёй адсутнічаюць. Нават у рабоце "Детские коллективы" якая належаць пяру вучня і саратніка Выгоцкага Д.Б.Эльконіну [5], уплыву гэтых яго ідэй не зауважаецца.

Нельга не звярнуць увагі і на той факт, што і Выгоцкі "прайшоу міма" праблемы зносін і узаемаадносін дзяцей, міма праблемы калектыву як самастойнага "сюжэта" сучаснай яму педагагічнай псіхалогіі. Адсюль і само паняцце "калектыу" у яго рабоце ніяк не абмяркоуваецца і не канкрэтызуецца. Трэба адзначыць, што гэта "паралельнае", незалежнае суіснаванне канцэпцый і тэорый, якія з розных бакоу гавораць аб адным і тым жа, нельга лічыць канчаткова пераадоленым і на сённяшні дзень.

Мы звярнуліся да аналізу тэарэтычных палажэнняу Выгоцкага, у якіх паказаны агульны шлях інтэрыярызацыі актау міжасобаснага узаемадзеяння ва унутрыасобасныя утварэнні, таму што у далейшых эмпірычных даследаваннях, у т. л. і у нашых уласных, ён знайшоу пацвярджэнне. Вядома, што прыведзеныя выказванні, па словах Выгоцкага, уяуляюць "вельмі агульнае і абстрактнае палажэнне аб калектыуным паходжанні вышэйшых псіхічных функцый..."[2, с.197]. У далейшым Выгоцкі і асабліва яго вучні у значнай ступені канкрэтызавалі уяуленні аб псіхалагічных механізмах гэтага працэсу. Сёння мы гаворым, што гэта "пераплаука" знешняга ва унутранае ажыццяуляецца ў пэунай "сацыяльнай сітуацыі развіцця", якая праз "перажыванне" уваходзіць у паняцце "унутранай пазіцыі", сфармуляванай Л.І.Бажовіч [1].

У нашых даследаваннях у якасці вядучага фактара сацыяльнай сітуацыі развіцця разглядаецца міжасобаснае узаемадзеянне дзіцяці з аднагодкамі і дарослымі у сумеснай дзейнасці унутры кантактных малых груп.

Унікальнасць асобы як вынік працэсу яе фарміравання і развіцця на працягу жыццёвага шляху вызначаецца тым, што яна, па-першае, паслядоуна уваходзіць у новыя, змяняючыя адна адну сітуацыі макра- і мікраасяроддзяу, кожная з якіх уносіць свой уклад у яе развіццё праз узаемадзеянне сацыяльных роляу. што вызначаюць яе поліролевую структуру.

З мэтай канкрэтнага аналізу працэсу "урастання" міжасобасных сітуацый у структуру асобы неабходна ажыццявіць іх дыферэнцыяцыю па прыкмеце здольнасці выклікаць працэс. У канкрэтных

даследаваннях неабходна перайсці ад агульнага паняцця "сацыяльная сітуацыя развіцця" да аналізу актуальных жыццёвых сітуацый асобы.

У залежнасці ад гісторыі індывідуальнага развіцця асобы жыццёвыя сітуацыі, удзельнікамі якіх яна з'яуляецца, маюць розную ступень уздеяння, розную уласцівасць прыводзіць да узнікнення асобасных новаутварэнняу. Як у мемуарнай літаратурь ("Пасля гэтага вечара я стау іншым..."), так і у педагагічных апісаннях (сітуацыі, апісаныя А.С. Макаранкам як прыклады "метаду выбуху"), кароткачасовая дынамічная сітуацыя мае большае уздзеянне на асобу, чым доугачасовая і стабільная. Відаць, неабходна увесці паняцце "персагенная сацыяльна-псіхалагічная сітуацыя развіцця асобы", у змест якога пасля спецыяльнага аналізу і эмпірычных даследаванняу уключыць характарыстыку адпаведных асобасных фактарау навакольнага асяроддзя, узаемадзеянне якіх і забяспечвае узнікненне асобасных новаўтварэнняў.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. *Божович Л. И.* Личность и её формирование в детском возрасте. М., 1968.
2. *Выготский Л. С.* История развития высших психических функций // Собр. соч. Т. 3. М., 1983.
3. *Выготский Л. С.* Коллектив как фактор развития дефективного ребенка // Собр. соч. Т. 5. М., 1983.
4. *Коломинский Я. Л.* Психология взаимоотношений в малых группах. Минск., 1976.
5. Эльконин Д.Б. Детские коллективы: Учеб. педагогики для педтехникумов. Ч.2 М.; Л., 1931.


## *SUMMARY*


*For your consideration is the problem of personality formation in collective in the light of Vygotsky's ideas. The fundamental psychological problem of personality development is bound up with the analysis of psychological aspects of Person-to-Person interaction and microsocial environment. The theoretical background of the ideas expressed in the article is connected with the name of well-known classic of World Psychology Vygotsky L.S.*